ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЛІСТАПАДА 2016 г. ЧАЦВЕР № 213 (28323)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Гурт Aillion: «Мы не «дыназаўры»**



**Кветкі ад Гошы**



**«За лішнюю вагу не выганяем»**

# У ДЭКАРАЦЫЯХ ЛІСТАПАДА



Першы ранні снег прынёс дарослым дадатковыя клопаты, а малечы – радасць. Напрыклад, гэтыя малыя жыхары сталічнага Зялёнага Луга зляпілі ўчора сярод жоўтага лісця снежную бабу. І нават не адну.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі:**

*«У нас на сёння, калі лічыць і грамадскія аб'яднанні, і іх арганізацыйныя структуры, афіцыйна зарэгістраваныя, больш за 40 тысяч грамадскіх фарміраванняў. Гэта сведчыць аб тым, што грамадзянская супольнасць актыўна развіваецца, настаянна паступаюць дакументы на рэгістрацыю, на пастаноўку на ўлік арганізацыйных структур у рэгіёнах. І колькасць грамадскіх арганізацый павялічваецца».*

## ТУТ СОНЦА ЎЗЫХОДЗІЦЬ НА ХВІЛЮ РАНЕЙ

Паўднёвы Усход
Сумесны праект газеты «Звязда» і Магілёўскага аблвыканкама

### Карэспандэнт «Звязды» накіравалася ў самы ўсходні горад краіны

**Летась у Магілёўскай вобласці была зацверджана праграма, якая павінна даць дадатковы імпульс развіццю эканамічнага патэнцыялу сямі паўднёва-ўсходніх раёнаў вобласці. Указам №235 для гэтага прадугледжаны сур'ёзныя льготы і прэферэнцыі, якія прывабныя для бізнесу і цікавыя для насельніцтва. Праграма будзе спрыяць стварэнню новых працоўных месцаў, будаўніцтву жылля, адным словам — росквіту. У рамках праекта «Паўднёвы Усход» «Звязда» працягвае расказваць, чым сёння жывуць гэтыя раёны і наколькі яны могуць быць цікавымі для патэнцыйных інвестараў. Мы пабывалі ў Чэрыкаўскім, Слаўгарадскім, Краснапольскім і Клімавіцкім раёнах. Цяпер рушым у Хоцімск, ці, як яго называюць тутэйшыя жыхары за аддаленасць ад абласнога цэнтра, — Далёкі Усход. А вось да мяжы з Расіяй адсюль, наадварот, няма і дзесяці кіламетраў.**

СТАР. 4



Дом, які будуецца згодна з Указам №235, хутка прыме навасёлаў.

■ Грамадства

## БЭБІ-БОКСЫ-БУМ

### Чаму немаўляты падвяргаюцца патэнцыйнай небяспецы?

**«Securityанароджанага знайшлі ў кантэйнеры з адходамі! Маці выкінула дзіця на сметнік!» — кожны падобны выпадак выклікае шырокі рэзананс у грамадстве. За апошнія некалькі месяцаў аб праблеме пачалі гаварыць яшчэ часцей: у канцы жніўня на дачным участку ў Пінскім раёне знайшлі закапанае цела немаўляці, а ў верасні жыхарка Мачулішчаў выкінула дзіця, якому было некалькі хвілін з роду, у смеццеправод. Адгукнуўшыся на хваляванні ў грамадстве, новы састаў парламента нават прапанаваў разгледзець ініцыятыву з бэбі-боксамі. Мы разабраліся, што гэта такое, якія маштабы праблемы і з якімі сацыяльнымі «дэманамі» трэба змагацца ў першую чаргу.**

### ЛЮТАСЦЬ ЦІ ХВАРОБА?

— Па афіцыйных звестках, за апошнія пяць гадоў было зарэгістравана 21 забойства нованароджанага, што складае каля 1% ад агульнага ліку забойстваў, — адзначыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення крымінальнай міліцыі МУС Віктар ЮЗЭФОВІЧ**. — З іх адно было здзейснена па неасцярожнасці: жанчына вырашыла, што дзіця нарадзілася нежывым, таму пазбавілася ад яго. Усе астатнія ў суадносінах 50:50 дзеляцца на два тыпы: наўмыснае забойства і дзеянні пад уплывам псіхатраўмуючай сітуацыі. У першым выпадку, у залежнасці ад абставін, злачынства можа пацягнуць за сабой ад 8 гадоў аж да вышэйшай меры — для жанчын гэта 25 гадоў пазбаўлення волі. У другім — да пяці гадоў пазбаўлення волі. Аднак да крайніх мер яшчэ не даходзіла, часцей за ўсё пакаранні адносна мяккія.

Калі разглядаць апошняе пяцігоддзе, то ні адна з 20 «недамаці», што дзіўна, не прыцягвалася раней да крымінальнай адказнасці. За імі было заўважана ўсяго два адміністрацыйныя правапарушэнні: за пражыванне без рэгістрацыі і пакінутую без нагляду распаленую печ. Гэта не асацыяльныя асобы, а нібыта зусім звычайныя жанчыны: студэнтка, прадаўшчыца і нават выхавацелька. Дзі і ўзрост свядомы, непаўналетніх сярод іх няма: жанчынам ад 18 да 28 гадоў.

СТАР. 3

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9042 | ▲ |
| Еўра | 2,1078 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0300 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0745 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
16213